**Вывучэнне тэмы “Якуб Колас” у X класе.**
**Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа**

Мэты:
- садзейнічаць засваенню вучнямі звестак пра жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа;
- развіваць пазнавальную актыўнасць, творчыя здольнасці вучняў;
- выхоўваць павагу да асобы вялікага песняра, патрыятычныя пачуцці.

Тып урока: урок тлумачэння новага матэрыялу.
Педагагічныя тэхналогіі: КСН – методыка Рывіна, сама- і ўзаемаправерка.
Абсталяванне: партрэт Якуба Коласа, карткі.

Эпіграф: Кнігі Коласа нам
і калыскай, і школай былі
і па новай зямлі
нас у сённяшні дзень прывялі.
Песні Коласа нас
навучылі Радзіму любіць,
родны край бараніць.
*Пімен Панчанка*

**Ход урока.**

**I. Арганізацыйны момант.**

*Настаўнік.* Добры дзень! Старажытныя грэкі казалі: “*Добры настрой – палова перамогі”. Я вам жадаю сёння на ўроку перамог.*

**II. Паўтарэнне.**

*Настаўнік.* Скажыце, калі ласка, з творчасцю якога пісьменніка мы знаёміліся на папярэдніх уроках? ( *Янкі Купалы).*
А з якім пісьменнікам нарадзіўся Янка Купала ў адзін год і з якім пасля сябраваў? (Якубам Коласам, 1882год). Так, сапраўды, з Якубам Коласам. І сёння мы з вамі пазнаёмімся з жыццёвым і творчым шляхам Якуба Коласа.

Яго цанілі Горкі і Твардоўскі, касманаўт Пётр Клімук лятаў у космас са зборнікам яго вершаў. Якуб Колас пісаў для дарослых і дзяцей, пісаў аб тым, што балела ў простага чалавека, якому выпала жыць у суровую эпоху сусветных войнаў. Менавіта яму, бясконца ўлюбёнаму ў родную мову, па натуры селяніну, па прафесіі настаўніку, а па прызванні пісьменніку, мы абавязаны росквітам беларускай літаратурнай мовы, для адраджэння і развіцця якой мала хто зрабіў больш, чым Колас. І калі Янка Купала – душа мовы, нябачная кветка папараці, то Якуб Колас – сама зямля.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

*Настаўнік.* Як вы думаеце, якія мэты сёння будуць стаяць перад намі?
(*Пазнаёміцца з жыццёвым і творчым шляхам знакамітага пісьменніка, запомніць даты, запомніць творы, якія напісаў Якуб Колас, высветліць, чаму Якуб Колас узяў сабе такі псеўданім).* Працаваць будзем у сшытках па літаратуры.

***1.Знаёмства з алгарытмам працы (на парце раздрукоўкі алгарытму)***

**Алгарытм працы па методыцы Рывіна.**

1. Атрымай тэкст і колеравы сігнал.
2. Знайдзі партнёра.
3. Прачытай партнёру ўвесь тэкст.
4. Прачытай партнёру адзін абзац.
5. Партнёр задае пытанні для таго, каб вы засвоілі сэнс абзаца, значэнне тэрмінаў.
6. Абмяркуйце магчымыя варыянты загалоўкаў, выберыце аптымальны.

*Улічыце!* Загаловак выражае сэнс абзаца, але не з'яўляецца яго канспектам.

7. Запішыце загаловак у свой сшытак.
8. Перакажы партнёру змест першага абзаца.
9. Працуй над другім абзацам так, як і над першым.
10. Па заканчэнні працы над тэкстам, падрыхтуйся да выступлення перад групай.
11. Калі праца над тэкстам закончана, зрабі неабходны запіс у сшытак.
12. Атрымай новы тэкст і сігнальны колер. Працуй з новым тэкстам па дадзеным алгарытме.

***Настаўнік****. Вы атрымаеце кожны па дзве карткі рознага колеру. Спачатку будзеце працаваць з жоўтай і зялёнай карткамі, а потым – з сіняй і чырвонай. Гэта значыць, што спачатку вывучыце матэрыял пра першую палову жыцця і творчасці Якуба Коласа, а затым пазнаёміцеся з працягам біяграфіі. У канцы ўрока вы будзеце ведаць увесь жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Перад класам хтосьці з вас раскажа біяграфію, а таксама пра творчасць нашага знакамітага класіка літаратуры.*

Картка жоўтая

**Жыццёвы шлях Якуба Коласа**

Нарадзіўся Я.Колас ( Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) 3 лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы, што непадалёку ад Стоўбцаў. Дзіцячыя гады, поўныя любові і шчасця, ранняй працы, якая заўсёды бывае ў сялянскіх сем'ях, вылепілі шырокую натуру сапраўднага беларуса. Жыццё ў маляўнічым Панямонні рана абудзіла ў Кастуся любоў да беларускай прыроды, роднай зямлі.

Вучыўся спачатку ў вандроўнага настаўніка, потым (1898-1894 гг) у народным вучылішчы ў вёсцы Мікалаеўшчына. З 1898 па 1902 год з'яўляецца навучэнцам Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, пасля заканчэння якой працуе ў школах Палесся Брэстчыны.

За ўдзел у двух нелегальных настаўніцкіх з'ездах у 1906 і 1908 гадах быў пазбаўлены працы ў школе. Атрымаў тры гады турэмнага зняволення ў Пішчалаўскім замку. Але гэта не зламала волю паэта: за турэмнымі кратамі і пачалася праца над паэмамі "Сымон-музыка" і "Новая зямля".

Пасля вызвалення з турмы з 1911 г. настаўнічаў на Піншчыне. У жніўні

1912 года на хутары Смольня адбылася першая сустрэча Якуба Коласа і Янкі Купалы, якая паклала пачатак сяброўству паміж паэтамі.

У 1915 годзе мабілізаваны ў армію. Скончыў ваеннае вучылішча, служыў у г.Перм, адтуль летам 1917 года трапіў на Румынскі фронт. Захварэў і быў эвакуіраваны ў г. Абаянь Курскай губерніі, дзе і сустрэў кастрычніцкія падзеі 1917 года.

Працаваў на Куршчыне настаўнікам, выкладаў у Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме, у БДУ, займаўся навуковай дзейнасцю ў Інстытуце беларускай культуры.

У 1926 годзе атрымаў званне народнага паэта БССР.

У 1928 годзе абраны акадэмікам АН БССР. У 1935 годзе ўдзельнічаў у рабоце Сусветнага кангрэса абароны культуры.

Картка чырвоная

**Жыццёвы шлях Якуба Коласа (**працяг)

У жніўні 1941 года Якуб Колас пераехаў у Ташкент. У гады ВАв жыў і працаваў у Ташкенце і Падмаскоўі.

Пасля вайны Колас вяртаецца на сваю радзіму і не пазнае яе. У руінах ляжалі многія гарады. Горкія думкі паэта пра родны край дапаўняюцца асабістым горам: не стала яго жонкі. Але паэт упэўнены, што загояцца раны, з пажарышчаў паўстане, расцвіце Беларусь ва ўсёй свай красе.

Вершы і паэмы, апавяданні і раманы, аповесці і драмы, рэалістычныя творы і алегарычныя “Казкі жыцця”, лірычныя вершы і сатырычныя апавяданні на бытавыя і сацыяльна-палітычныя тэмы – выключна ўсе літаратурныя жанры горда прадстаўлены ў творчасці песняра.

Якуб Колас не толькі класік нашай нацыянальнай літаратуры, але і выдатны вучоны, педагог. Доўгі час ён выкладаў методыку роднай мовы і літаратуры ў Белпедтэхнікуме і Белдзяржуніверсітэце. Будучы ўжо знакамітым, ездзіў па гарадах нашай Беларусі і выступаў з лекцыямі на настаўніцкіх курсах.

У ноч з 12 на 13 жніўня 1956 года Якуб Колас памёр. Жыў за пісьмовым сталом, за ім і памёр, да апошніх хвілін паглынуты працай.

Пахаваны Якуб Колас на Вайсковых могілках у Мінску.

Картка зялёная

**Творчы шлях Якуба Коласа**

У дзяцінстве Колас захапляўся творамі А.Пушкіна, М.Лермантава, В.Жукоўскага, казкамі і апавяданнямі Л.Талстога, вершамі Я.Лучыны.

Першы верш Міцкевіча "Наш родны край" быў надрукаваны ў газеце "Наша доля" 1 верасня 1906 года пад псеўданімам Якуб Колас. І назва верша, і псеўданім аўтара былі сімвалічнымі і вызначальнымі для ўсёй творчасці песняра, якую ён, як і сваё жыццё, прысвяціў роднай зямлі і шчыраму на ёй сейбіту – народу.

У 1910 годзе выйшаў першы зборнік паэта – "Песні жальбы", а ў 1914 годзе другі – "Родныя вобразы". Паэзія Якуба Коласа – гэта паэзія тугі і смутку.У творах многа лірычных, шчырых вершаў пра бацькаўшчыну, пра "забыты богам край".

У 1912 г. Быў выдадзены зборнік "Апавяданні", у 1913 г. – "Нёманаў дар", у 1914 г. Выйшла яго кніга прозы "Родныя з'явы".

У 20-я гады выйшлі ў свет многія кнігі Я.Коласа. У творах гэтага перыяду пісьменнік расказвае пра мінулае беларускага народа, пра падзеі грамадзянскай вайны, пасляваеннае будаўніцтва.

1911-1923 гг. – эпічная паэма "Новая зямля".

1911 – 1025 гг. – лірычная паэма "Сымон-музыка".

Асноўная тэма творчасці Я.Коласа 30-х гадоў – перабудова вёскі на новы лад, стваральная праца беларускага народа, яго барацьба супраць замежных інтэрвентаў.

Картка сіняя

**Творчы шлях Якуба Коласа** ( працяг)

У ліпені 1941 года быў надрукаваны зварот Я.Коласа і Я.Купалы "Беларускаму народу", у якім прагучаў заклік да змагання супраць фашысцкіх захопнікаў. У гады ВАв Якуб Колас выдаў зборнікі вершаў "Адпомсцім", "Голас зямлі", паэмы "Суд у лесе", "Адплата". У творах гэтага перыяду гучаць настальгічныя пачуцці пісьменніка па Радзіме, які па волі лёсу апынуўся далёка ад "родных межаў".

У алегарычных апавяданнях "Казкі жыцця", якія пісаліся на працягу 50-ці гадоў, аўтар імкнецца абагульніць разнастайныя жыццёвыя з'явы, раскрыць складанасці навакольнага свету, паказаць адзінства чалавека і прыроды. У казках жывуць, думаюць, па-філасофску разважаюць дрэвы, рачулкі, птушкі, хмаркі, камяні.

Творы Якуба Коласа – гэта цэлая панарама жыцця беларускага народа на розных этапах гістарычнага развіцця. Творы Коласа - гэта гімн у гонар роднага краю.

2. *Пераказ тэкстаў пры дапамозе апорных слоў і плана.*

3. *Падагульненне.*

- Пра якія звесткі з жыцця і творчасці Якуба Коласа вы даведаліся ўпершыню?

**IV. Віктарына ў карцінках.**





1.На якім з музычных інструментаў, што знаходзіліся ў яго доме, іграў Якуб Колас?(скрыпка)



2.Дзе знаходзіцца дом-музей Якуба Коласа, пададзены на гэтым здымку?
(у Мінску)





3.Героі з якіх твораў увасоблены майстрам па дрэве? (Лабановіч,“На ростанях”, Сымон, “Сымон-музыка”)



4.Лялечны персанаж з якога твора? (паэма “Сымон-музыка”)



5. Дзе ўстаноўлены гэты помнік Якубу Коласу? ( у г.Стаўбцы)

V. **Рубрыка “Для вас, эрудыты”**

1.*Чаму, знаходзячыся ў турме, Я.Колас адпусціў доўгую бараду?*

(Пад час штодзённых праверак, ён хаваў у бараду невялікія паперкі з рукапіснымі накідамі да будучых твораў “Новая зямля” і “Сымон-музыка”).

2.*Чаму Канстанцін Міцкевіч абраў сабе псеўданім Якуб Колас?*

1) КОЛАС – сімвал жыццялюбства, жыццястойкасці, шчодрасці і плёну. Хлебны колас стаў сімвалічным выяўленнем сутнасці зямной дзейнасці пісьменніка.

2) Псеўданім Якуб Колас з’явіўся на хвалі ідэйнай: пачынаючы аўтар, як і многія яго равеснікі, зачытваўся вершамі Пятра Якубовіча-Мельшына, які ў 1900-ыя гады валодаў вялікім уздзеяннем на маладыя “умы”. Асабліва любіў малады Міцкевіч яго верш аб коласе. Так і з’явіўся псеўданім, слава якога надоўга перажыла вядомасць прародзіча: **Якуб –** у гонар Якубовіча, **Колас –** у гонар таго самага каласка).

3.*Якое дачыненне мае Якуб Колас да з’яўлення Мінскага мора?*

( Па сутнасці, пісьменнік стаў нефармальным дарадчыкам беларускага першага сакратара. Менавіта так апісваецца размова Я.Коласа з ім: “Паглядзіце, Гродна – на рацэ Нёман, Брэст – на Заходнім Бугу, Магілёў – на Дняпры, Віцебск – на Заходняй Дзвіне, Пінск і Мазыр – на Прыпяці. Вось і атрымалася, што ўсе буйныя гарады ... на вялікіх рэках, а Мінску не пашанцавала. Час падумаць аб вялікім вадасховішчы для мінчан)

**IV. Падагульненне ўрока. Рэфлексія.**

- Што падалося вам самым цікавым на ўроку?

  ***Метад “Алфавіт”***

  **Я-**яркасць
  **К-**крэатыўнасць
  **У-**упэўненасць
  **Б-**бадзёрасць

  **К-**“Казкі жыцця”
  **О-** одум
  **Л-** Лабановіч
  **А-** Акінчыцы
  **С-** “Сымон-музыка”

**V. Дамашняе заданне**

I група: запоўніць графы крыжаванкі;



# Гэта ты, палескі край

Палессе ў творах народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. 3 лістапада – 140 год з дня яго нараджэння

**Па гарызанталі:** **1.** ... зіме сцежку пракладвае (прык.). **4.** «Быў у замку дзед ... // Родам дзесь з-пад Мазыра». З паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка». **8.** «Тым часам ... святы мінуўся, // І лес у чырвань апрануўся». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Падгляд пчол»). **9.** Натуральны налог у Рускай дзяржаве. **11.** Паляўнічаму і ў сне ... сніцца (прык.). **12.** «Гэта ты, балот краіна! // Гэта ты, палескі ...!». З верша Я. Коласа «Палескія вобразы». **14.** «... на дубе расспяваўся. // Жураўлі ўжо ляцяць». З верша Я. Коласа «Вясна». **16.** Вялікае лісцевае дрэва. **17.** «Свішчуць птушкі над балотам, // Аж гамоніць лес і ...». З верша Я. Коласа «Вясна на Палессі». **18.** ... і любоў – усяму галава (прык.). **19.** Адзін снап ці ... коп – хлеба на год (прык.). **21.** Партыя для аднаго голаса. **22.** Агародная расліна, прыправа да ежы. **28.** Завод па першаснай апрацоўцы лесаматэрыялаў. **30.** «Плыве з Мазыра «... Купала», // З Пінска гукае «Якуб Колас». З верша Ул. Верамейчыка «Цеплаходы «Янка Купала» і «Якуб Колас» на Прыпяці». **31.** ... ці кнігаўка; балотная птушка. **32.** ... ў лістападзе – быць мяккай зіме (прыкм.). **33.** «У балоце, на купені, ... спеюць. // Адзін мяне пацалуе, // Трычатыры млеюць». Прыпеўка.

**Па вертыкалі:** **1.** «Апошні лістападаўскі ... // Яшчэ жывы, чапляецца за дрэва». З верша Г. Дашкевіч «Лебедзь над Прыпяццю». **2.** Народнае эпічнае апавяданне. **3.** У вясельным абрадзе месца, куды садзяць нявесту. **5.** Прэснаводная рыба, якую ў лістападзе ловяць на блясну ці на мармышку. **6.** ... і алень; млекакормячыя жывёліны, у якіх у лістападзе адбываюцца «вяселлі» (гон). **7.** Па восені і ў кошкі ляпёшкі, і ў вераб'я ... (прык.). **10.** «Які ты, хлопча, нецярпячка, // Няхай цябе затопча ...». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Дзядзька-кухар»). **13.** ... або асеннія дзяды. Дзень памінання продкаў, які адзначалі 2 лістапада. **15.** «Я люблю твой ..., // Гмах шырокіх балот». З верша Я. Коласа «Палессе». **20.** Узаранае поле. **23.** «На Палессі былі // Розныя ..., // Быў і з гэтым папом // Выпадак цікавы». З верша Я. Коласа «Як поп зрабіўся авіятарам». **24.** «Вось пастух ужо стадка гоніць; // Вол бушуе і раве». З верша Я. Коласа «... на Палессі». **25.** Тое, што і вепр. **26.** «Пафарбавала восень клёны // У ... жоўты і чырвоны». З верша В. Шымука «Колеры восені». **27.** Харчовы прадукт. **29.** Лістапад – паўзімнік; мужык з калёсамі развітваецца, у ... перабіраецца (прык.).

II група: напісаць міні-сачыненне на адно з выказванняў Якуба Коласа:

“ Толькі на ўласных каранях дае дрэва багаты плод”

“ Сэнс нашага жыцця – несупынны рух”

“ Шчасце можа быць поўным толькі тады, калі ўсе вакол цябе адчуваюць сябе шчаслівымі”

“ Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш”

“ Няма ў чалавека нічога прыгажэй і даражэй за радзіму. Чалавек без радзімы – бедны чалавек”